**Т. А. Фіцнер**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КУРСА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зыходзячы з таго факта, што сучасная цывілізацыя – гэта інфармацыйная цывілізацыя, а XXI стагоддзе – стагоддзе інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій (ІКТ), выкарыстанне ІКТ у навучальным працэсе з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснай сістэмы адукацыі на ўсіх яе ступенях. Перш чым весці гаворку пра выкарыстанне ІКТ на занятках па выкладаемай вучэбнай дысцыпліне абавязковага кампанента «Гісторыя беларускай літаратуры (пачатак XX стагоддзя)», варта ўзгадаць, што «інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў адукацыі – гэта сукупнасць метадаў, прыбораў і працэсаў, якія выкарыстоўваюцца для збору, апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі і выкарыстання яе ў адукацыйным працэсе» [1].

Выкарыстане ІКТ у адукацыйным працэсе, нягледзячы на тое, што мае, як і любая з’ява, свае станоўчыя і адмоўныя бакі, з’яўляецца патрабаванем часу, і вымагае ад выкладчыка вну (наогул настаўніка на ўсіх ступенях адукацыі) валодання, акрамя ключавых, ІКТ-кампетэнцыямі, якія яму неабходна набываць самастойна, каб ісці ў нагу з часам, адпавядаць сучасным патрабаванням, урэшце быць канкурэнтназдольным. Сучасныя задачы адукацыі патрабуюць ад выкладчыка пастаяннай гатоўнасці да самаўдасканалення, да самаадукацыі.

Ёсць меркаванне, што ў інфармацыйным грамадстве мяняецца і змест дзейнасці выкладчыка. Ён «перастае быць адно толькі

«рэпрадуктарам» ведаў, становіцца распрацоўшчыкам новай тэхналогіі навучання, што, з аднаго боку, павышае/павялічвае яго творчую актыўнасць, а з другога – патрабуе высокага ўзроўню тэхналагічнай і метадычнай падрыхтаванасці» [2]. Слушнай у гэтым кантэксце з'яўляецца і думка, што «галоўнай кампетэнцыяй настаўніка-прадметніка становіцца яго абноўленая роля – роля праваднiка ведаў, свайго роду «навігатара», які дапамагае навучэнцам арыентавацца ў бязмежным моры інфармацыі» [3].

Да камп'ютарных ІКТ адносяць лекцыі-прэзентацыі, электронныя навучальныя дапаможнікі; арганізацыю выніковага кантролю (тэставыя заданні); выступленні, даклады. Спынімся на разглядзе лекцый-прэзентацый і іх станоўчых момантах. Агульнавядома, што найбольшую колькасць інфармацыі (прыкладна 90%) чалавек атрымлівае з дапамогай зроку, па гэтай прычыне лекцыя-маналог малацікавая для сучасных студэнтаў, якія штодзённа «спажываюць» найперш візуальную інфармацыю з уласных дэвайсаў/смартфонаў. Замацаваныя на дошцы партрэты пісьменнікаў і крэйда для запісу некаторых тэрмінаў ці складаных прозвішчаў таксама малаактуальныя ў свеце развіцця сучасных кампьютарных тэхналогій.

По гэтай прычыне ўсё больш актуальнай і запатрабаванай робіцца лекцыя-прэзентацыя, якая:

– пашырае інфармацыйную насычанасць урока;

– павялічвае прадукцыйнасць працы выкладчыка (і студэнтаў);

– дапамагае ажыццяўляць прынцып нагляднасці, неабходны на занятках па літаратуры;

– робіць лекцыю эмацыйна насычанай;

– палягчае працэс засваення новага матэрыялу, бо адначасова ўздзейнічае на зрок, слых і іншыя органы пачуццяў слухача.

У лекцыю-прэзентацыю па вывучэнні жыцця і творчасці пэўнага пісьменніка, дзякуючы магчымасцям сеткі Інтэрнэт, можна ўключыць:

– разнастайныя фотаздымкі (партрэты пісьменнікаў, іх родных, сяброў; фота месцаў нараджэння, помнікаў, месц пахаванняў і ўвекавечванняў памяці; фота іх выданняў і інш.);

– відэаматэрыялы (віртуальныя экскурсіі у музеі, на малую радзіму пісьменнікаў, фрагменты экранізацый мастацкіх твораў, фрагменты запісаў спектакляў па драматургічных творах і інш.);

– аўдыяінфармацыю (агучаныя фрагменты з мастацкіх твораў пісьменнікаў, вершы і песні на вершы паэтаў).

Падборка і выкарыстанне вышэй адзначаных матэрыялаў адрозніваецца ў залежнасці ад вывучаемага аўтара і наяўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інфармацыі ў сеціве. Для выкладання курса «Гісторыя беларускай літаратуры (пачатак ХХ стагоддзя)» з выкарыстаннем ІКТ непасрэдна мною:

– па-першае, падрыхтавана шэраг лекцый-прэзентацый з выкарыстаннем праграмы PowerPoint па творчасці Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, А.Гаруна і інш. Напрыклад, лекцыя-прэзентацыя па драматургічнай спадчыне Я.Купалы суправаджаецца фрагментамі са спектакляў па п'есах аўтара («Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя») ў выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. А разгляд паэмы Я.Коласа «Новая зямля» – фрагментамі з аднайменнага тэлефільма рэжысёра-пастаноўшчыка Ул.Траццякова (1982 г.);

– па-другое, шырока выкарыстоўваюцца відэаматэрыялы па біяграфіі вывучаемых пісьменнікаў. Пры гэтым, каб актывізаваць увагу студэнтаў пры праглядзе, ім раздаюцца папераджальныя заданні-пытанні, адказы на якія неабходна запісаць падчас прагляду відэасюжэта і здаць выкладчыку для выстаўлення адзнакі;

– па-трэцяе, пры разглядзе творчасці паэтаў-класікаў выкарыстоўваюцца аўдыязапісы вершаў класікаў ці песень на іх вершы ў выканані айчынных акцёраў, артыстаў эстрады і ансамбляў (напрыклад, песні на вершы Я.Купалы, Я.Коласа і М.Багдановіча ў выкананні знакамітых «Песняроў»);

– па-чацвёртае, падрыхтаваны і актыўна выкарыстоўваецца ЭВМК [4] па выкладаемай дысцыпліне для спецыяльнасці «Руская філалогія» студэнтаў дзённай і завочнай форм навучаня, у тэарэтычнай частцы якога змешчаны тэкст лекцый па біяграфіі і творчасці кожнага з аўтараў, што вывучаюцца ў дадзеным курсе. Гэта дае магчымасць студэнтам самастойна прапрацаваць матэрыял, пададзены ў лекцыі-прэзентацыі (тэарэтычнай часткай ЭВМК могуць карыстацца і студэнты спецыяльнасці «Беларуская філалогія»); Практычная частка ўтрымлівае прыклады складзеных аўтарам тэстаў і індывідуальныя заданні па біяграфіі і творчасці кожнага аўтара, якія прапаноўваюцца студэнтам на практычных для кантролю іх падрыхтаванасці да заняткаў і засваення ведаў па тэме, што ў сваю чаргу стымулюе студэнтаў рыхтавацца да заняткаў рэгулярна, бо апытванне адбываецца на кожных практычных з выстаўленнем адзнак, якія ўплываюць на выніковую адзнаку на экзамене.

Падсумоўваючы, зазначым, што інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў сістэме адукацыі набываюць усё большую значнасць; спрыяюць развіццю і студэнта, і выкладчыка; палягчаюць працу



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выкладчыка; разам з тым ІКТ не могуць (і не павінны) замяніць жывога слова настаўніка, таму актуальным застаецца пытанне пачуцця меры ў выкарыстанні найноўшых кампьютарных тэхналогій.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Кручинина, Г. А. Информационно-коммуникационные технологии в деятельности преподавателя / Г. А. Кручинина [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pravmisl.ru/index.php?id=673&option=com_content&task=view. – Дата доступу : 27.01.2020.

2. Ложкова, З. И. Использование информационно-коммуникационных технологий на уроках русского языка и литературы / З. И. Ложкова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://nsportal.ru/shkola/raznoe/library/2017/10/18/doklad-na-temu-ispolzovanie-informatsionno-kommunikatsionnyh. – Дата доступу : 27.01.2020.

3. Шевчук, А. П. Использование информационно-коммуникационных технологий на уроках русского языка, литературы / А. П. Шевчук [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://urok.1sept.ru/статьи/678746/. – Дата доступу : 27.01.2020.

4. Фіцнер, Т. А. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры (пачатак ХХ стагоддзя)» / Т. А. Фіцнер [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://dot3.gsu.by/course/view.php?id=1378.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ